# Не «наКЛІКаць» бы бяды

### НЕ ВЕР СВАІМ ВУШАМ...

Трэба адзначыць, што абсалютна новых схем, па сутнасці, не так і многа. Асноўны алгарытм дзеянняў застаецца нязменным — мяняюцца акалічнасці і нюансы. Як адзначаюць супрацоўнікі банкаўскіх службаў бяспекі, ускладняюцца старыя спосабы падману, што павышае шанцы махляроў на поспех і не дазваляе аператыўна выкрыць і затрымаць злачынцаў.

Так, напрыклад, змяняецца частая, усім вядомая схема з «заблакіраванай» карткай (афармленнем крэдыту, падазронымі дзеяннямі ў асабістым кабінеце мабільнага або інтэрнэт-банкінга). Калі раней у месенджары проста тэлефанаваў нібыта супрацоўнік банка або праваахоўных органаў і спрабаваў выведаць дадзеныя банкаўскай карткі, то цяпер спачатку тэлефануе адзін з іх і загадзя «папярэджвае» пра тэлефонны званок ад праваахоўнікаў ці з банка. Такім чынам увага ахвяры аслабляецца, а давер да субяседніка ўзрастае. Больш за тое, злачынцы ўсё часцей выкарыстоўваюць праграмы для падмены тэлефонных нумароў, і вызначальнік вашага смартфона паказа, што тэлефануюць менавіта з банка. А вынік гэткіх шматхадовак адзін — страчаныя грошы давераліва кліента. Дарэчы, від махлярства з дапамогай тэлефоннай сувязі завецца вішынгам. Да яго ж адносяцца і паведамленні аб блізкіх, якія трапілі ў непрыемнасці або ў бальніцу.

### ...І ВАЧАМ

Яшчэ адзін распаўсюджаны спосаб падману — фішынг, сутнасць якога ў стварэнні ашуканцамі фальшывых інтэрнэт-старонак. Яны могуць імітаваць любыя афіцыйныя сайты: ад банкаўскіх да вядомых інтэрнэт-магазінаў ці службаў дастаўкі. Праз іх злачынцы атрымліваюць дадзеныя картак і скрадваюць з іх усе сродкі. У гэтую пастку лёгка трапляюць, напрыклад, як прадаўцы, так і пакупнікі сайтаў прыватных аб'яў, або карыстальнікі сацыяльных сетак, дзе часцяком анансуюцца «грандыёзныя распродажы астаткаў» нейкіх тавараў. І, канешне, абавязкова па перадаплаце. На жаль, не дапамагаюць тут шматлікія папярэджанні наконт асцярожных зносін у месенджарах, недапушчальнасці паведамлення CVV2 кода (лічбаў на адваротным баку карткі) каму-небудзь і тых жа пакупак па перадаплаце... Аднак, ёсць у арсенале махляроў і больш грозная зброя: шкодныя спасылкі ў электронных лістах, паведамленнях у сацсетках або SMS-паведамленнях. У гэтым выпадку вы можаце загрузіць на свой камп'ютар або смартфон вірусную праграму, якая прадаставіць зламысніkам доступ да асабістага кабінета ў мабільным ці інтэрнэт-банкінгу. А гэта ўжо нашмат небяспечней.

### «РАНІЦАЙ — ГРОШЫ, ВЕЧАРАМ — КРЭСЛЫ»

Калі вышэйназваныя спосабы даволі вядомыя, то некалькі наступных не настолькі відавочныя, але не менш шкодныя. Па-першае, звернем увагу на заўзятараў VPN-сэрвісаў. Здавалася б, што тут такога, наадварот — я абараняю сваю канфідэнцыяльнасць! Але не ўсё так проста. Справа ў тым, што ўсе дадзеныя, якія вы ўводзіце на камп'ютары ці смартфоне, па сутнасці становяцца бачнымі для трэціх асоб — распрацоўшчыкаў сэрвісу. Добра, калі тыя добрасумленныя, а калі не? Іх жа зараз столькі, што лічыць — не пералічыць. Да слова, спецыялісты па лічбавай бяспецы ўвогуле раяць не карыстацца нават бясплатнымі VPN, не гаворачы ўжо пра ўзламаныя дадаткі.

Наступная махінацыя тычыцца працаўладкавання. Дакладней — работы ў інтэрнэце: нядобрасумленныя «работадаўцы» абяцаюць высокія заробкі кандыдатам без адукацыі ці вопыту работы. А потым патрабуюць грашовыя ўнёскі, маўляў для страхоўкі або доступу да нейкіх заказаў. Ці, як у выпадках з «платнымі» апытаннямі і «выйгрышамі» ў латарэю, трэба ўнесці пэўную суму нібыта для вываду зароблены сродкаў. Зразумела, што ўнёсак гэты пойдзе ў кішэню ашуканца. Схема немудрагелістая, але... Чалавечае жаданне зарабіць многа і без якіх-небудзь значных намаганняў — раскошнае поле дзеяння для махляроў. Тут яны могуць таксама прапанаваць набыць каштоўныя паперы вядомых прадпрыемстваў, уклaсціся ў «перспектыўную» крыптавалюту...

Асобным радком стаяць тыя, хто падманвае людзей пад выглядам збору сродкаў на лячэнне дзяцей або родзічаў. Яны часцей за ўсё арудуюць у сацыяльных сетках і папросту падрабляюць існуючыя дабрачынныя зборы: бяруць сапраўдныя фатаграфіі ці аб'явы і мяняюць у іх рэквізіты плацяжоў. Таму, перш чым зрабіць пералічэнне на дабрачынны рахунак, пашукайце ў інтэрнэце падобныя аб'явы і параўнайце рэквізіты. А лепш за ўсё — дапамагайце праз вядомыя і буйныя дабрачынныя фонды.

### «МЯНЕ КРОЯЦЬ ТРЫВОЖНЫЯ СУМНЕННІ...»

І ўсё ж, якімі б выкрутлівымі ні былі жулікі, выявіць іх можна: у большасці схем яны выкарыстоўваюць адны і тыя ж прыёмы ўздзеяння на патэнцыяльных ахвяр. Дык што павінна вас насцярожыць?

Па-першае, тое, што вас паскорваюць, нават падганяюць, маўляў усё трэба зрабіць вельмі хутка, бо... А далей варыянтаў безліч: афармяць крэдыт на ваша імя, картка заблакіруецца разам з рахункам, не паспееем дапамагчы родзічу, раскупяць апошнія высокадаходныя акцыі і гэтак далей. Па-другое, у вас выпытваюць коды, патрабуюць зняць у банкамаце наяўныя грошы, а калі тэлефануе нібыта супрацоўнік праваахоўных органаў, то яшчэ і пагражаюць пакараннем за адмову супрацоўнічаць. Гэта што тычыцца вішынгу. У іншых выпадках звярнайце ўвагу, напрыклад, на розныя, здавалася б, дробязі: абяцанні высокіх заробкаў ці велізарных даходаў ад грашовых укладаў, гарантыі 100-працэнтнага прыбытку, прапановы папаўнення рахунку праз крыптавалюту, нават на наяўнасць «замочка» ў адрасным радку сайта і гэтак далей. Увогуле ж, трэба заўсёды памятаць адну простую ісціну: «Бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы».

### ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ?

Спецыялісты дэпартамента бяспекі Беларусбанка даюць наступныя рэкамендацыі:

— нікому не паведамляйце рэквізіты банкаўскай карткі (нумар, тэрмін дзеяння, CVV2/CVC2 код, пароль 3D-Secure), логіны, паролі, дадзеныя карты кодаў, коды аўтарызацыі;

— заўсёды пераправярайце інфармацыю, якую атрымалі ад тэлефоннага субяседніка або ў паведамленнях у сацсетках і месенджарах. У падазроных ці незразумелых абставінах абавязкова патэлефануйце ў банк самастойна;

— не пераходзьце па незнаёмых спасылках, не адкрывайце ўкладанні ў электронных лістах ці паведамленнях у сацыяльных сетках;

— памятайце — банкі ніколі не запытваюць дадзеныя па тэлефоне, у месенджарах, праз рассылку SMS-паведамленняў, лістоў на электронную пошту;

— калі здымаеце наяўнасць у банкамаце, уважліва агледзьце яго на пабочныя прадметы;

— усталёўвайце і рэгулярна абнаўляйце антывіруснае праграмнае забеспячэнне на камп'ютарах, планшэтах, смартфонах;

— захоўвайце лічбавую гігіену.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Германіі 20 чалавек абвінавачваюцца ў планаванні дзяржперавароту

Паліцыя Германіі правяла вобыскі ў васьмі федэральных землях па справе аб планах дзяржаўнага перавароту ў краіне, 20 чалавекам прад'яўлена абвінавачанне, паведаміла газета Bild. Пад кіраўніцтвам Генпракуратуры Мюнхена прайшліператрусы ў Баварыі, а таксама Гамбургу, Бадэн-Вюртэмбергу, Гесэне, Брандэнбургу, Ніжняй Саксоніі, Паўночным Рэйне — Вестфаліі і Шлезвіг-Гальштэйне. Як паведаміла Генеральная пракуратура Мюнхена і паліцэйскае ўпраўленне Верхняй Баварыі, абвінавачаныя (члены праваэкстрэмісцкага руху «Грамадзяне Рэйха») праз пагрозы і шантаж, выкарыстоўваючы сацыяльныя сеткі і мабільную сувязь, спрабавалі ўстанавіць кантакты з прадстаўнікамі ўлады, каб незаконна паўплываць на іх рашэнні. «Галоўнай мэтай дзейных асоб было дэстабілізаваць Федэратыўную Рэспубліку Германія, а таксама яе дзяржаўныя ўстановы», — заявілі ў Генпракуратуры Мюнхена. У канцы мінулага года Генпракуратура Германіі арыштавала больш за 20 чалавек па падазрэнні ва ўдзеле ў змове з мэтай захопу ўлады ў рэспубліцы. Служба абароны канстытуцыі краіны падлічыла, што летась колькасць «Грамадзян Рэйха» ў Германіі стала на 2 тысячы большай у параўнанні з мінулым годам і склала 23 тысячы чалавек.

### Польскія перавозчыкі перакрылі пастаўку ва Украіну вайсковых грузаў

Польскія перавозчыкі на граніцы перакрылі пастаўку ва Украіну вайсковых грузаў і іншых крытычна важных тавараў, паведамляецца ў Telegram-канале інтэрнэт-газеты «Страна». «Паліва, беспілотнікі, цеплавізары, тавары медыцынскага прызначэння і гуманітарная дапамога не могуць быць дастаўлены ва Украіну з-за пратэстаў польскіх перавозчыкаў на кантрольна-прапускных пунктах», — паведамляецца ў сацсетцы. Таксама на граніцы «затрымаліся» камплектуючыя для дэтэктараў назірання беспілотнікаў «Ланцэт». Раней намеснік міністра інфраструктуры Украіны Сяргей Дзяркач заявіў, што былі зафіксаваны шматлікія факты, калі цыстэрны з палівам і машыны з гуманітарнай дапамогай стаяць у чэргах. Ён адзначыў, што інфармацыя аб парушэннях была перададзена польскаму боку. Між тым Варшава адмаўляе абвінавачанні ў затрымцы грузаў.

Прававая дапамога

# Тастаменты, спадчына, даверанасці

## У Мінску абмеркавалі работу базавай арганізацыі СНД у сферы натарыяту

**Абмен вопытам, перадавымі навінкамі ў сферы натарыяльнай дзейнасці, павышэнне кваліфікацыі натарыусаў. З гэтым мэтамі ў маі 2022 года была створана базавая арганізацыя дзяржаў — удзельніц СНД у сферы натарыяльнай дзейнасці, дзе кіруючым органам стала Беларуская натарыяльная палата (БНП). Днямі ў Мінску прайшло другое пасяджэнне арганізацыі, дзе падвялі дасягнутыя за гэты час вынікі работы і запланавалі задачы на будучыню. Сярод іх — стварэнне электроннага ўзаемадзеяння паміж натарыятамі, каб спрасціць дакументаабарот і больш аператыўна атрымліваць звесткі падчас аказання прававой дапамогі людзям. У натарыятах спадзяюцца, што гэта зможа адбыцца ўжо налета. На першае паўгоддзе 2024-га запланаваны, напрыклад, круглы стол, дзе спецыялісты абмяркуюць этапы лічбавізацыі натарыяльнай дзейнасці.**



### Даверaны трэці бок

Арганізацыя, якая працуе ўжо два гады, першая такая суполка юрыдычнага профілю на прасторах СНД. Сёння важна разумець, як яе стварэнне паўплывала на натарыяльныя практыкі краін, таму што за гэты час членамі натарыяльнай суполкі ў межах СНД сумесна праведзена шмат мерапрыемстваў і дасягнута нямала вынікаў, адзначыла **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты (БНП):**

— Да ўдзелу ў мерапрыемствах прыцягваліся вучоныя, практыкуючыя юрысты, натарыусы неаднаразова ўдзельнічалі ў пасяджэннях рабочых груп Выканаўчага камітэта СНД. Зараз мы на парозе пераходу да электроннага абмену дакументамі як унутры натарыяльных суполак, так і ў прыватным праваым парадку. Іншымі словамі, мы хочам даць магчымасць грамадзянам, якія атрымалі натарыяльны акт у выглядзе электроннага дакумента, прад'явіць яго ў суседняй краіне без перaводу на папяровы носьбіт. Сёння гэтаму пакуль крыху перашкаджае адсутнасць існавання ў нашых краінах даверaных трэціх бакоў. Гэта арганізацыі, якія створаны ўжо ў некалькіх краінах і дазваляюць правяраць на сапраўднасць і цэласнасць электронны дакумент, створаны і абаронены ў адпаведнасці з заканадаўствам аднай дзяржавы, і пацвердзіць, што ў гэты дакумент не ўносіліся змены і яго змесцу можна давяраць. І гэта вельмі важна, калі мы працуем з дакументамі, якія пацвярджаюць пэўныя маёмасныя і немаёмасныя правы грамадзян.

Са з'яўленнем такой магчымасці для людзей будуць створаны камфортныя ўмовы, а натарыусы змогуць аператыўна абменьвацца інфармацыяй. Гэта таксама паўплывае і на выніковы кошт дакумента, таму што скароціцца час на работу з ім і павысіцца якасць работы ў цэлым, удакладніла старшыня БНП.

### Курс на электроннае ўзаемадзеянне

Асноўная задача базавай арганізацыі СНД у сферы натарыяльнай дзейнасці — умацаванне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і абмену вопытам натарыятаў, падкрэсліў **Мікалай СТАРАВОЙТАЎ, намеснік міністра юстыцыі Беларусі:**

— Нягледзячы на існаванне асаблівасцяў прававога рэгулявання пытанняў натарыяльнай дзейнасці ў краінах — удзельніцах СНД, паміж іх натарыятамі шмат агульнага. Хутчэй за ўсё таму, што ўсе яны выйшлі з Савецкага Саюза. І самая галоўная іх задача — забяспечыць абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян шляхам здзяйснення натарыяльных дзеянняў.

За два гады ў сферы натарыята было зроблена шмат работы. Гэта стажыроўкі, абмен практыкамі і вопытам, відэаканферэнцыі, семінары, вебінары. Вельмі цікавым, напрыклад, стаўся абмен натарыяльным вопытам у сферах аўтамотатранспарту, электроннага апастылю і электроннага дакументаабароту, падзяліўся ўражаннямі **Дзілшод АШУРАЎ, старшыня натарыяльнай палаты Рэспублікі Узбекістан:**

— У найбліжэйшай будучыні мы плануем абменьвацца дакументамі паміж краінамі ў электронным варыянце. Гэта можа датычыцца, напрыклад, даверанасцяў на здзяйсненне здзелак прадстаўніком арганізацыі на месцы (за мяжой). Сёння мы можам правяраць, ці адменена даверанасць, ці існуе тастамент, або ці адкрыта спадчынная справа ў краінах — удзельніцах базавай арганізацыі.

Найбольш і найперш важныя і рэальныя для ажыццяўлення ў сферы электроннага ўзаемадзеяння паміж краінамі СНД, на думку старшыні натарыята Узбекістана, задачы спадчынных спраў, праверкі даверанасцяў і тастаментаў:

— Гэта тое, што мы павінны бачыць у электронным фармаце і што сёння магчыма зрабіць. У далейшым, калі гэта будзе магчыма заканадаўча, можна будзе разглядаць і іншыя натарыяльныя дзеянні.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**